**Акарачкова І.У.,**
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай
мастацкай культуры

# АСАБЛІВАСЦІ МУЗЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ДЗЯЦЕЙ

У даследаванні функцыянальна-змястоўных асаблівасцей музыкі і яе выкарыстання ў працэсе стварэння тэатралізаваных прадстаўленняў для дзяцей намі аналізавалася адметнасць музычнага ўспрымання дзяцей.

У псіхалогіі ўспрыманне — гэта цэласнае адлюстраванне прадметаў, сітуацый і падзей, што ўзнікаюць пры непасрэдным уздзеянні фізічных раздражняльнікаў на рэцэптарныя паверхні. Разам з працэсамі адчування ўспрыманне забяспечвае непасрэдна пачуццёвую арыенціроўку ў прасторы. Успрыманне як дзейнасць уключае сістэму дзеянняў, якія дазваляюць выявіць аб'ект, пазнаць яго, змерыць, ацаніць. Склад гэтых дзеянняў залежыць ад ступені разумення таго, што ўспрымаецца, і ад характару задачы: навошта, з якой мэтай чалавек глядзіць і слухае.

Асноўныя ўласцівасці ўспрымання — гэта перш за ўсё цэласнасць атрыманага вобраза прадмета ў разнастайнасці яго бакоў, якасцей. Другая ўласцівасць — прадметнасць (аднесенасць нагляднага вобраза ўспрымання да прадметаў знешняга свету або момантаў аб'ектыўнай рэчаіснасці). Трэцяя ўласцівасць — гэта асэнсаванасць: усведамленне таго, што ўспрымаецца, тлумачэнне вобразаў, якія ўзнікаюць у выніку ўспрымання, суаднясенне з ведамі суб'екта, яго мінулым вопытам, наданне ім пэўнага сэнсу. Чацвёртая ўласцівасць — адлюстраванне адзінкавых аб'ектаў як асаблівай праявы агульнага, што ўяўляе клас аб'ектаў, аднародных з дадзеным па якой-небудзь прымеце. Пятая ўласцівасць — гэта канстантнасць, адноснае пастаянства ўспрымання формы, велічыні і колеру прадметаў пры зменлівых умовах іх успрымання,



Рэпазіторый БДУКіМ

дзякуючы чаму прадметы пазнаюцца ў розных абставінах. Выбіральнасць — гэта пераважнае вылучэнне адных аб'ектаў у параўнанні з іншымі, што раскрывае актыўнасць чалавечага ўспрымання.

Успрыманне звязана з мысленнем, памяццю, увагай, уяўленнем і залежыць ад назапашаных ведаў, уяўленняў. Яно мае пэўную афектна-эмацыянальную афарбоўку. Вырашальным фактарам з'яўляецца ўключанасць яго ў працэсы практычнай дзейнасці, зносін. Але пры гэтым успрыманне — не проста пасіўнае капіраванне імгненнага дзеяння, а творчы працэс пазнання, магчымасць трансфармацыі вобраза з мэтай прывядзення яго ў адпаведны выгляд.

Успрыманне — гэта першы ўзровень пазнання свету, пачуццёвы, які ажыццяўляецца пры дапамозе органаў пачуццяў. На яго аснове будуецца рацыянальнае пазнанне, накіраванае на выяўленне істотных сувязей, уласцівасцей і адносін паміж прадметамі. Мысленне дазваляе выйсці за даступныя ўспрыманню межы. Дзіця не нараджаецца з гатовымі магчымасцямі, дакладней, уменнем успрымаць што-небудзь. На ранніх этапах развіцця ўспрыманне яшчэ недасканалае. Усе перцэптыўныя дзеянні фарміруюцца пры жыцці ў працэсе ўзаемадзеяння з аб'ектам успрымання, назірання, развіваюцца і ўдасканальваюцца яны па меры назапашвання жыццёвага вопыту. Зыходным перыядам фарміравання з'яўляюцца 2—3-і гады жыцця, але найбольш значныя больш познія перыяды: дашкольны і школьны ўзрост, калі ідзе мэтанакіраванае фарміраванне перцэптыўных дзеянняў. Гэта навучанне дарослымі таму, як глядзець і бачыць, слухаць і чуць. Такія паняцці не з'яўляюцца тоеснымі.

Успрыманне — гэта разгорнуты працэс. Аналізуецца вялікая колькасць розных прымет прадмета. Па меры развіцця ўспрымання колькасць гэтых адзнак скарачаецца. Застаюцца толькі самыя значныя з іх, якія ў далейшым пачынаюць выконваць сацыяльную функцыю. Так фарміруюцца аператыўныя адзінкі ўспрымання — сенсор-

Рэпазіторый БГУКИ

ныя эталоны: ідэальныя вобразы, што захоўваюцца ў памяці, з якімі параўноўваецца тое, што ўспрымаецца ў дадзены момант (тон колеру, контуры прадмета, вышыня гуку).

Пры фарміраванні музычнага ўспрымання павінны ўлічвацца ўсе гэтыя прыметы і ўласцівасці. Само паняцце музычнага (мастацкага) успрымання — паняцце шырокае. Яно ўключае ўспрыманне, уяўленне, абстрактнае мысленне, работу творчага мастацкага ўяўлення і спецыфічную мову.

Музыка — гэта перш за ўсё асаблівая форма адлюстравання рэчаіснасці, калі яе разглядаць як мастацтва. Таму музычнае ўспрыманне — гэта спасціжэнне і асэнсаванне значэнняў, якія мае музыка як мастацтва, эстэтычна-мастацкая з'ява. Музыку спараджае грамадства, дзе чалавек жыве. З другога боку, яна адлюстроўвае яго жыццё і ў сваю чаргу ўздзейнічае на яго. А значыць, музыка можа выконваць ролю не толькі прафесійнага выхавання, але і, напрыклад, маральнага.

Слухач выхоўваецца культурай, якая яго акружае, успрымае музычны твор у адпаведнасці з навыкамі, крытэрыямі, выпрацаванымі грамадска-музычнай практыкай. Адлюстроўвае музыка рэчаіснасць таксама з пазіцый суполкі — уяўленняў аб жыццёвых ідэалах, поглядах, і ў гэтым яе спецыфіка.

Працэс успрымання пачынаецца з распазнавання выкарыстаных у музычных творах моўных элементаў і іх змястоўнага значэння. Слухач, падрыхтаваны і знаёмы са знакавай сістэмай, чуе больш і не так, як непадрыхтаваны. Музычная мова ўяўляе сістэму ўстойлівых тыпаў гукаспалучэнняў разам з нормамі іх ужывання, але, у адрозненне ад мовы вербальнай, яе элементамі з'яўляюцца не канкрэтныя ўстойлівыя ўтварэнні (знакі), а тыпы гукаспалучэнняў. Кожны з элементаў мае мноства патэнцыяльных значэнняў (адрозненне ад вербальнай мовы і універсальнасць музыкі ў плане "неперакладальнасці на іншую мову" і ў тым, што інтанацыя — носьбітка музычнага зместу, а ў гутарцы сэнсавая нагрузка на словы, інтанацыя адыгрываюць дапаможную ролю).

Музычнае ўспрыманне выкарыстоўвае спецыфічныя і неспецыфічныя прыёмы: сенсорныя, кінетычныя, прасторавыя, сацыяльна-моўныя. Гэткім жа чынам можна вылучыць характэрныя спецыфічныя сродкі, звязаныя з музычнай сістэмай (лад, гармонія) і менш характэрныя, менш звязаныя з ёю (рытм, тэмп, тэмбр, рэгістр). Уваходжанне ў сістэму ідзе за кошт характэрных сродкаў. Гэта трэба ўлічваць пры рабоце з пачаткоўцамі.

Музычнае ўспрыманне складаецца з многіх аперацый: пошуку, выяўлення, вылучэння той ці іншай прыметы, кадзіравання і сінтэзу атрыманага ў рухомыя сістэмы. Тут яно мае актыўны характар, ажыццяўляецца пад уплывам задач, пастаўленых перад суб'ектам, і, абапіраючыся на ўдзел гатовых кодаў — мовы, элементаў мінулага вопыту, спецыфічных музычных кодаў, — уключае ўспрымаемае ў тую ці іншую сістэму, надаючы яму катэгарыяльны характар.

У працэсе асэнсавання прыводзяцца ў дзеянне механізмы, што фарміруюць элементы, якія таксама выступаюць у далейшым як коды. У працэсе ўсведамлення ў залежнасці ад мэты можа выбірацца той ці іншы код,у чым таксама выяўляецца актыўнасць. Адбываецца паступовае назапашванне знакавых сістэм "новай" мовы і пераход да больш асэнсаванага ўспрымання, ад знешняга — да ўнутранага.

Дзеці чуюць і разумеюць толькі музычныя адзінкі, якія ўкладваюцца ў асвоеную музычную тэхніку выканання і чуцця, суправаджаючыся перажываннямі, што не выходзяць за межы іх вопыту. Значыць, галоўнае — даступнасць адпаведна ўзросту і паступовасць асваення. На жаль, гэта выпускаюць з-пад увагі. На наш погляд, лепш наогул не вадзіць дзяцей у тэатр або на канцэрт, калі той недасяжны для іх узроўню. Гэта звязана з тым, што складаны комплекс знакавай сістэмы дзіця ўспрымае як хаос і, акрамя стойкага незадавальнення, гэтае наведванне нічога не выкліча. Потым прыцягнуць яго пасля такога "паходу" да слухання будзе цяжка. З другога боку,

Рэпазіторый БГУКІ

чалавеку не захочацца салодкага, калі ён не каштаваў, — іншымі словамі, патрэбнасць не ўзнікае “ на пустым месцы”.

З дзяцінства трэба сфарміраваць патрэбнасць слухаць і наведваць: тады захочацца рабіць гэта пазней. З гэтых двух момантаў павінна зыходзіць работа педагога, накіраваная на выяўленне логікі і сэнсу ў “незразумелым” пакуль гучанні. Тут выяўляецца яшчэ адна асаблівасць музычнага ўспрымання. Яго логіка адрозніваецца ад навуковай, у якой магчымы толькі адзін правільны адказ.

У музыцы пераплецены эмацыянальныя перажыванні і мастацка-вобразнае мысленне, што адрозніваецца ад рацыянальнага. У працэсе слухання ўзнікаюць асацыяцыі, заснаваныя на ранейшым слыхавым вопыце.

Мастацкая вобразнасць, асацыятыўнасць, эмацыянальнае перажыванне — гэта найважнейшыя асаблівасці музыкі, на што трэба звяртаць увагу.

Дзеля накіраванасці музычнага ўспрымання важная афарбаванасць. Акрамя ўваходжання ў гукавую сістэму, у чалавека выпрацоўваецца спецыяльны псіхічны механізм. У выніку гэтага глядач, слухач не проста дазнаюцца аб падзеях, а і эмацыянальна перажываюць іх, засвойваюць эмацыянальныя адносіны да праўдзівасці вобраза. Але гэта не звычайныя пачуцці, а адметны від мастацкіх эмоцый, таму што мастацтва, у прыватнасці музыка, нясе функцыі выяўлення, перадачы, асваення людзьмі па-грамадску сфарміраванага пачуццёвага вопыту як фактару чыста чалавечага развіцця і сукупнасці розных адносін, з якіх складаецца аснова паводзін у грамадстве.

Навука не можа выканаць гэтай функцыі. На гэта не звяртаецца ўвагі ў поўным аб'ёме. Эмацыянальная афарбаванасць, вобразнасць павінна ахопліваць і мову педагога, падачу практычнага і тэарэтычнага матэрыялу. Як правіла, ён вылучаецца ў асобную сферу. Калі гэта адбываецца, то з'яўляюцца вяласць, сум, страта інтарэсу да дзейнасці. У выніку паняцці музычнай тэорыі, музычнай пісьменнасці не супадаюць. А музычная культура не залежыць ад ступені засваення нотнай граматы, правіл.



Рэпазіторый БГУКІ

Музычная пісьменнасць — гэта здольнасць успрымаць музыку як вобразнае мастацтва, народжанае жыццём. Таму не павінны існаваць адцягнутыя ад музыкі правілы і практыкаванні, якія патрабавалі б завучвання і шматразовага паўтарэння. Завучваць можна многа, але завучанае ў любым відзе дзейнасці не пакіне следу ў свядомасці, калі будзе незразумелым, нецікавым, а калі і цікавым, то эмацыянальна не пражытым. Вучань павінен абавязкова перажываць матэрыял эмацыянальна. Станоўчыя эмоцыі, як вядома, стымулююць успрыманне.

Эмацыянальная памяць удзельнічае ва ўсіх відах памяці. На ёй непасрэдна заснавана трываласць запамінання матэрыялу. Тое, што выклікае моцныя эмацыянальныя перажыванні, запамінаецца больш трывала і на працяглы тэрмін. Наадварот, больш складаныя, менш цікавыя падзеі чалавек перажывае дзесяткі разоў, але ў памяці надоўга яны не застаюцца. Па меры развіцця дзеці ўспрымаюць музыку адпаведна эмацыянальнаму зместу (радуючыся або сумуючы), пазней — яе музычныя выразныя сродкі.

Біялагічны сэнс эмоцый не толькі ў ацэнцы, але і ў імгненнай падрыхтоўцы аналізатараў да дзеяння. Апошнія могуць або актывізаваць, або стрымліваць успрыманне. У рабоце з вучнямі, асабліва малодшымі, гэта можна выкарыстаць. Малодшыя школьнікі, дашкольнікі дзейнічаюць у асноўным на базе першай сігнальнай сістэмы, непасрэдна прымаючы сігналы ад з'яў. У той жа час рэгулюючая дзейнасць другой сігнальнай сістэмы недастатковая. Таму яны лёгка ўзбуджаюцца, не могуць утойваць сваіх эмоцый, якія маюць часовы характар, таму іх трэба замацоўваць. У залежнасці ад характару ўспрымання знаходзяцца яго вынік і пункт яго адліку.

Успрыманне можа быць пярвічнае або шматразовае, спецыяльна або выпадкова падрыхтаванае (суджэннем педагога, іншымі гледачамі, папярэднім знаёмствам) або не падрыхтаванае. У фарміраванні музычнага ўспрымання павінен прысутнічаць наступны ланцужок: папярэдж-вальнае ўспрыманне (устаноўка) — удакладняльнае

Репозиторий БГУКИ

(пытанні, гутарка) — замацавальнае (вынік, паўтор). Пры наяўнасці ланцужка ўспрымацца будзе тое, на што накіравана ўспрыманне, галоўнае. Тады эфект адкладання ў памяці будзе вышэй. З дапамогай гэтага ланцужка адбываюцца асэнсаванне матэрыялу, актыўная работа з ім. Значыць, з'яўляецца магчымасць для ацэнкі (мастацкае ўспрыманне, як вядома, — адзінства пазнання і ацэнкі, ацэнка ж — паказчык актыўнасці псіхалогіі).

Акрамя ацэнкі, музычнае ўспрыманне рэгулюецца ўстаноўкамі памяці і перадслухання, актуалізацыі элементаў мінулага вопыту. Адбіваюцца на ім таксама індывідуальныя асаблівасці псіхічных працэсаў.

**Доўнар Л.І.,**
суіскальнік кафедры
бібліяграфіі і дакументазнаўства

## МІНСКІЯ ВЫДАННІ XIX–ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ Ў ФОНДАХ РАСІЙСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

Расійская нацыянальная бібліятэка з'яўляецца адным з буйнейшых кнігасховішчаў свету з фондам у 30 мільёнаў адзінак захоўвання. Створана яна была ў 1795 г. як Імператарская публічная бібліятэка, а асновай паслужыла вывезеная з Варшавы А.В. Суворавым бібліятэка графаў Залускіх, большая частка якой паводле Рыжскага дагавора 1921 г. вярнулася ў Польшчу(1).

Пачынаючы з 1811 г. бібліятэка атрымлівае абавязковы экземпляр усёй айчыннай прадукцыі, а з 1850 г. штогод выдае свае справаздачы, якія з'яўляюцца каштоўнымі матэрыяламі як для гісторыі кнігазбору, так і для бібліяграфіі наогул(2). Бібліятэцы належыць самы поўны збор рускай кнігі (12 млн.), які захоўваецца ў рускім фондзе, а таксама ў аддзеле рэдкай кнігі бібліятэкі.